ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
У.У. Рыжкоў
« 22 » мая 2018 г.

## Кантрольны дыктант
## 10 клас

### Высокая сталіца

Сённяшні Навагрудак меў старажытную назву Наваградак. Вучоныя-археолагі маюць доказы, што людское паселішча тут узнікла ў канцы дзясятага стагоддзя.

Вядома, што Навагрудак стаіць на гары, якая ўзнімаецца над узроўнем мора на трыста дваццаць тры метры. Гэта самае высокае месца ў Беларусі. І з якога б боку ні ехаў сюды, адчуваеш, што ўздымаешся ўвысь, туды, дзе векавыя руіны вежаў былога замка, дзе цэрквы і касцёлы, сівыя камяніцы.

З гары Замкавай узіраўся ў далячынь сваёй дзяржавы Міндоўг – стваральнік Вялікага Княства Літоўскага. Ён заклаў падмурак нашай дзяржавы.

Да скалечаных муроў замка прыходзіў паэт Адам Міцкевіч. Навакольныя краявіды натхнялі наваградца на паэзію, якая вывела яго ў геніі.

З высокага Навагрудка, здаецца, бачны ўвесь раён: і задумлівы бацька-Нёман, і зялёны дыван Налібоцкай пушчы, і ўраджайныя палеткі, і ўсе сельскія населеныя пункты і гарадскі пасёлак.

Старажытны горад Наваградак нанова перажывае сваю маладосць.
(137 слоў)

*Паводле У.Ліпскага*

### Дадатковае заданне

| 1 варыянт | 2 варыянт |
|---|---|
| ***1. Вызначце:*** | |
| тып тэксту (дыктанта) | стыль тэксту (дыктанта) |
| ***2. Выпішыце два словы:*** ***адно, у якім напісанне супадае з вымаўленнем;*** ***другое, у якім напісанне не супадае з вымаўленнем*** | |
| з першых двух абзацаў | з трэцяга - шостага абзацаў |
| ***3. Выпішыце з тэксту прапанаваную ніжэй часціну мовы і зрабіце*** | |

| | |
|---|---|
| ***яе марфалагічны разбор:*** | |
| назоўнік | прыметнік |
| ***4. Зрабіце сінтаксічны разбор:*** | |
| другога сказа першага абзаца | другога сказа чацвёртага абзаца |